ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙ

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 26 (513) | Субота, 2 кастрычніка 1982 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

*7-га кастрычніка — Дзень Канстытуцыі СССР*



## НАШ АСНОЎНЫ ЗАКОН

7-га кастрычніка савецкі народ у пяты раз адзначае дзень прыняцця новай Канстытуцыі СССР. Сёлета гэты дзень адзначаецца ў абстаноўцы асаблівага ўздыму — напярэдадні святкавання 65-годдзя Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі і 60-годдзя ўтварэння СССР. Гэтыя даты, узятыя ў іх заканамернай узаемасувязі, даюць магчымасць яскрава ўявіць той вялікі гістарычны шлях, які пройдзены нашай краінай больш чым за шэсць дзесяцігоддзяў свайго існавання і ацаніць яго сусветнае значэнне.

Канстытуцыя 1977 года — чацвёртая па ліку савецкая канстытуцыя — з'явілася ўвасабленнем тых найвялікшай важнасці перамен, якія адбыліся ў жыцці нашай краіны за апошнія дзесяцігоддзі. Наша Канстытуцыя — гэта канстытуцыя развітога сацыялізму, які паступова перарастае ў камунізм. У тэксце Канстытуцыі СССР даецца разгорнутая характарыстыка гэтага этапа развіцця савецкага грамадства, вызначаецца палітычная і эканамічная сістэма і сацыяльная аснова СССР, указваюцца асноўныя прынцыпы нашай унутранай і знешняй палітыкі. Канстытуцыя ўстанаўлівае асноўныя правы, свабоды і абавязкі грамадзян і ўказвае на рэальныя сродкі гарантыі гэтых правоў і свабод. Напрыклад, артыкул 40 Канстытуцыі СССР указвае, што такое важнейшае з грамадзянскіх правоў, як права на працу, забяспечваецца «сацыялістычнай сістэмай гаспадаркі, няўхільным ростам вытворчых сіл, бясплатным прафесіянальным навучаннем, павышэннем працоўнай кваліфікацыі і навучаннем новым спецыяльнасцям, развіццём сістэмы прафесійнай арыентацыі і працаўладкавання». Гэтыя радкі Канстытуцыі адлюстроўваюць нашу рэчаіснасць, наш сённяшні дзень і таму з'яўляюцца звыклымі для нас. Але мы адразу ацэнім усё іх значэнне, адчуем, што стаіць за імі, калі ўспомнім, што ва ўсіх капіталістычных краінах, буржуазныя лідэры якіх так любяць крычаць аб дэмакратыі, права на працу не прадугледжваецца канстытуцыяй, або застаецца на паперы. Аб гэтым сведчаць мільёны галодных і беспрацоўных у гэтых краінах. Тое ж самае адносіцца і да ўсіх іншых адлюстраваных у канстытуцыі грамадзянскіх правоў буржуазных краін.

Гармонія паміж рэчаіснасцю і Асноўным Законам у нашай краіне вызначаецца самой сутнасцю нашага ладу, тым, што СССР, як гаворыцца ў Канстытуцыі, гэта «сацыялістычная агульнанародная дзяржава, якая выражае волю і інтарэсы рабочых, сялян і інтэлігенцыі, працоўных усіх нацый і народнасцей нашай краіны». Агульнанародны характар нашай дзяржавы адлюстроўваецца, напрыклад, у тым, што у Саветах, якія з'яўляюцца палітычнай асновай нашай дзяржаўнасці, працуюць 2,3 мільёна дэпутатаў, прадстаўнікоў больш чым 100 нацыянальнасцей і народнасцей. Саветы ў сваёй працы абапіраюцца на шырокія масы насельніцтва.

Цяпер, напярэдадні 60-годдзя з дня ўтварэння СССР, з усёй паўнатой паўстае перад намі жыватворная сіла аднаго з асноўных канстытуцыйных прынцыпаў сацыялістычнай дзяржавы — раўнапраўя грамадзян СССР усіх рас і нацыянальнасцей, а таксама ўсіх савецкіх рэспублік. Паслядоўнае ўвасабленне гэтага прынцыпа ў жыццё дазваляе з поспехам вырашаць адну з важнейшых задач сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця — дасягнення фактычнай роўнасці ўсіх нацый і народнасцей нашай краіны. Аб гэтым сведчаць поспехі ў развіцці эканомікі і культуры народаў, якія знаходзіліся раней на нізкіх ступенях развіцця, былі нават пад пагрозай выраджэння. Так, напрыклад, калі агульнасаюзны ўзровень прамысловай прадукцыі за гады Савецкай улады ўзрос амаль у 160 разоў, то ў нашай рэспубліцы — у 221, у Казахстане — у 238, Арменіі — у 362 разы. Як адзначаў тав. Л. І. Брэжнеў на XXVI з'ездзе КПСС, у Сярэдняй Азіі, дзе да Кастрычніка земляроб ведаў толькі цяжкую ручную працу, энергаласычанасць на 100 га ворыва цяпер удвая перавышае сярэднесаюзную.

Выкладчыкі і студэнты нашага універсітэта, які і ўсе савецкія людзі, маюць магчымасць у поўнай меры карыстацца дасягненнямі рэальнага сацыялізму, якія замацаваны ў нашай Канстытуцыі. Гэта гарантаванае Канстытуцыяй права на адукацыю, свабода навуковай, тэхнічнай і мастацкай творчасці. Як вядома, ажыццяўленне правоў і свабод непадзельна з выкананнем кожным грамадзянінам сваіх абавязкаў. Большасць выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта добра разумеюць гэта, аб чым сведчаць іх поспехі ў працы і ў вучобе, добрасумленныя і творчыя адносіны да сваіх абавязкаў. Канстытуцыя адкрывае перад кожнай асобай, перад кожным калектывам і нашым грамадствам новыя шырокія прасторы для ўсебаковага развіцця на шляху будаўніцтва камунізму.

**Р. ЛАЗЬКО,**
**в. а. дацэнта кафедры гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі.**

## ДЗЕЛЯ МІРУ НА ЗЯМЛІ

Вахта міру, якая распачата ў нашым універсітэце, набывае новыя формы. У сувязі з падзеямі ў Ліване, якія ўскалыхнулі ўвесь свет сваёй нечуванай жорсткасцю, свае подпісы ў абарону міру выказалі жаданне паставіць новыя сотні людзей. Гэта ўжо не толькі студэнты і супрацоўнікі універсітэта, але і тыя, з кім студэнты сутыкнуліся ў час летняй практыкі, у трэцім працоўным семестры. Усяго свае подпісы пад заклікам у абарону міру паставілі 1.808 чалавек. Сярод іх служачыя, рабочыя, калгаснікі, вучні, ваеннаслужачыя, пенсіянеры, студэнты.

Аднагасова на мітынгу байцоў студэнцкіх атрадаў быў прыняты зварот да кіраўніка арганізацыі вызвалення Палесціны Ясіра Арафата. У звароце гаворыцца: «З гневам і боллю сочым мы за трагедыяй, якая адбываецца на ліванскай зямлі. Мы далучаем свой голас да голаса ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва і патрабуем тэрміновага спынення ізраільскай акупацыі, безагаворачнага вываду войск інтэрвентаў з ліванскай тэрыторыі».

Своеасаблівай справаздачай аб рабоце ў абарону міру стаў допіс, падрыхтаваны камітэтам камсамола ў рэдакцыю газеты «Комсомольская правда». У ім паэтапна аднаўляецца гісторыя гэтага пачынання ў нашай навучальнай установе. У допісе, у прыватнасці, гаворыцца: «Вахта міру стала для студэнтаў нашага універсітэта не проста часовай кампаніяй, а справай усяго жыцця камсамольскай арганізацыі. Мы разумеем, што наш голас — гэта толькі ручай. Але ён уліваецца ў магутны голас народаў свету, якія пратэстуюць супраць палітыкі ядзернага вар'яцтва».

На чарзе ў камітэта камсамола новыя планы, ажыццяўленне якіх стане значнай вяхой у рабоце камсамоліі ГДУ, увальецца ў агульную справу абароны міру на зямлі.

(Наш кар.).

## АДЗНАЧАНА КАМСАМОЛАМ

**Гомельскі абком ЛКСМ Беларусі ўзнагародзіў Ганаровай граматай Савет маладых вучоных Гомельскага дзяржаўнага універсітэта (старшыня — кандыдат філасофскіх навук Р.Я. Мінянкоў). Адзначаны плённы удзел маладых вучоных ГДУ у абласным туры рэспубліканскага агляду-конкурсу саветаў маладых вучоных і спецыялістаў.**

**Цэнтральны райком ЛКСМБ Гомеля ўзнагародзіў граматай камсамольскую арганізацыю нашага універсітэта за трэцяе месца ў аглядзе работы пярвічных камсамольскіх арганізацый навучальных устаноў па выкананню рашэнняў XXVI з'езда КПСС па выніках першага паўгоддзя 1982 года.**

## З УЗНАГАРОДАЙ!

**За шматгадовую, плённую працу па прапагандзе марксізму-ленінізму і палітыкі КПСС бюро абкома КПБ узнагародзіла Ганаровай Ленінскай граматай дацэнта кафедры філасофіі нашага універсітэта выкладчыцу універсітэта марксізму-ленінізму абкома КПБ ГАРАНІНУ Тамару Пятроўну.**

**За плённую работу па прапагандзе марксізму-ленінізму і палітыкі КПСС, высокую якасць і выніковасць марксісцка-ленінскай вучобы Ганаровай граматай абкома КПБ і абласнога Савета народных дэпутатаў узнагароджана дацэнт кафедры філасофіі ГДУ няштатны лектар Гомельскага гаркома КП НЯДЗЕЛЯ Ларыса Іванаўна.**

## НА СЕМІНАРЫ САКРАТАРОЎ

Партыйны камітэт кожны месяц праводзіць семінар сакратароў пярвічных партыйных арганізацый універсітэта, на якім абмяркоўваюцца самыя актуальныя пытанні. Чарговы такі семінар адбыўся на мінулым тыдні ў пятніцу. Аб узмацненні ідэйна-палітычнага выхавання студэнцкай моладзі гаварыў у сваім выступленні намеснік сакратара парткома па арганізацыйнай рабоце Я. А. Семянчук. Намеснік сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце У. М. Калмыкоў падрабязна расказаў аб арганізацыі сістэмы палітвучобы ў ГДУ у новым навучальным годзе. Сакратар парткома М. І. Старавойтаў сваё выступленне прысвяціў пытанню падрыхтоўкі да 60-годдзя СССР. Адзначана, што да гэтай юбілейнай даты на ўсіх факультэтах павінны быць праведзены тэматычныя выстаўкі з мэтай адлюстравання дасягненняў савецкай навукі за 60 гадоў існавання СССР.

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат гісторыка-філалагічнага факультэта, кафедра беларускай літаратуры горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры ШТЭЙНЕРА Івана Фёдаравіча з выпадку зацвярджэння яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.**

* * *

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат матэматычнага факультэта горача віншуюць загадчыка кафедры тэорыі функцый і матаналізу МУХІНА Уладзіміра Васільевіча з выпадку зацвярджэння яго ВАКам у вучоным званні дацэнта.**

* * *

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат эканамічнага факультэта горача віншуюць МАКСІМОВІЧ Алену Іванаўну з кафедры ўліку і статыстыкі з выпадку зацвярджэння яе ВАКам у вучоным званні дацэнта.**

*Заўтра — Дзень настаўніка*

# САЮЗ НАВУКІ І ПРАКТЫКІ

ДЗЕНЬ настаўніка — гэта свята не толькі тых, хто працуе ў школе, а кожнага, хто сваёй працай садзейнічае камуністычнаму выхаванню падрастаючага пакалення. Мы маем на ўвазе перш за ўсё вялікі атрад савецкіх вучоных — педагогаў, метадыстаў, работнікаў органаў народнай асветы, выкладчыкаў універсітэтаў і педагагічных інстытутаў — усіх тых, хто рыхтуе педагагічныя кадры, арганізуе і накіроўвае іх працу ў агульнаадукацыйнай школе. Вялікую і шматгранную работу ў гэтым напрамку вядзе кафедра педагогікі і псіхалогіі нашага універсітэта.

Самай важнай формай аказання навукова-метадычнай дапамогі школе з'яўляецца распрацоўка навукова-метадычных пытанняў удасканальвання навучання і выхавання вучняў і стварэнне адпаведных дапаможнікаў для настаўнікаў і класных кіраўнікоў. Многія падрыхтаваныя на кафедры дапаможнікі шырока выкарыстоўваюцца ў школах не толькі нашага горада і вобласці, але і за межамі рэспублікі. Так, у 1975 годзе быў выдадзены 130-тысячным тыражом дапаможнік «Этычныя гутаркі з вучнямі» для настаўнікаў і класных кіраўнікоў. Тры гады таму назад выйшаў у свет вучэбны дапаможнік «Педагогіка», аўтарам якога з'яўляецца загадчык нашай кафедры член-карэспандэнт АПН СССР прафесар І. Ф. Харламаў. Сааўтарам дапаможніка «Настаўніку-стажору» стаў дацэнт нашай кафедры Р. М. Аўчыннікаў. Сёлета выдавецтвам «Народная асвета» у Мінску выдадзена падрыхтаваная пад навуковым кіраўніцтвам І. Ф. Харламава кніга «Этычныя гутаркі з вучнямі. IV клас». Тыраж гэтага дапаможніка — 100 тысяч экземпляраў. У яго падрыхтоўцы прымалі ўдзел члены кафедры А. В. Саннікава, В. П. Горленка, Г. А. Гудзілін, Г. Р. Гусева, Л. І. Радзінская, аўтары гэтых радкоў, а таксама настаўнікі гомельскіх і сельскіх школ, іншыя работнікі органаў народнай асветы. Гэтым жа аўтарскім калектывам у папярэднім навучальным годзе падрыхтаваны адпаведны дапаможнік аб'ёмам 15 друкаваных аркушаў для вучняў пятых класаў. Ён павінен выйсці ў выдавецтве ў наступным годзе.

На рахунку членаў нашай кафедры шэраг каштоўных навукова-метадычных артыкулаў, змешчаных у часопісах і асобных зборніках. Многае зроблена і для таго, каб разнастаіць формы і павысіць змястоўнасць лекцыйнай работы з настаўнікамі і кіраўнікамі школ. На працягу некалькіх гадоў па плану абласной арганізацыі таварыства «Веды» кафедрай распрацоўваюцца і арганізуюцца лекцыі для настаўнікаў, кіраўнікоў школ і бацькоў вучняў па праблемах навучання і камуністычнага выхавання падрастаючага пакалення. Цыклы такіх лекцый прачытаны ў Лоеўскім, Веткаўскім, Добрушскім і іншых раёнах вобласці. А ў Буда-Кашалёўскім і Кармянскім раёнах члены кафедры выступалі перад настаўнікамі з лекцыямі па цыклу «Удасканальванне вучэбна-выхаваўчай работы ў святле рашэнняў XXVI з'езда КПСС».

У названых раёнах у школах і на прамысловых прадпрыемствах для бацькоў вучнёўскай моладзі прачытаны цыкл лекцый «Павышэнне ролі сям'і ў маральным выхаванні дзяцей».

Члены нашай кафедры актыўна ўдзельнічаюць у правядзенні абласных навукова-метадычных семінараў прапагандыстаў, якія арганізуюцца аддзелам прапаганды і агітацыі абкома КПБ і Домам палітасветы.

Важнай формай навукова-метадычнай работы па сувязі са школай з'яўляюцца кансультацыі настаўнікаў і класных кіраўнікоў пры падрыхтоўцы імі метадычных дакладаў і рэфератаў. Так, прафесар І. Ф. Харламаў даваў кансультацыю намесніку дырэктара гомельскай СШ № 38 Н. С. Купцовай пры напісанні ёй рэферата «Псіхолага-педагагічныя заканамернасці працэсу навучання». Яна таксама зрабіла апрабацыю на кафедры свайго даклада аб актывізацыі вучэбнай работы школьнікаў, які рыхтавала для выступлення на гарадскім семінары дырэктараў школ.

Карысныя кансультацыі былі дадзены і для намесніка дырэктара Урыцкай СШ А. І. Мельянцава, дырэктара Курыціцкай СШ Петрыкаўскага раёна М. Е. Буглака, арганізатара пазакласнай і пазашкольнай выхаваўчай работы гомельскай СШ № 31 М. П. Рухлі, намесніка дырэктара ІУН Д. В. Дабрыніна, дырэктара васьмігадовай школы з Чачэрскага раёна І. Ю. Русака і многіх іншых. Настаўнікі гомельскіх СШ №№ 16 і 34 атрымалі кансультацыі па пытаннях, звязаных з выхаваўчай работай школьнікаў.

Члены кафедры вядуць карысную даследчую работу ў школах нашага горада і вобласці. У гэтым напрамку найбольш прадуктыўна працуе дацэнт М. І. Мурачкоўскі. Ён вывучае тыповыя асаблівасці вучэбнай дзейнасці вучняў розных узроставых груп. Асноўнай базай для яго работы сталі СШ №№ 5 і 25 г. Гомеля. Вучоны знаёміць настаўнікаў з асабістай канцэпцыяй тыпізацыі вучняў у вучэбнай дзейнасці, навучае іх розным дыягнастычным методыкам, выступае з паведамленнямі аб навейшых псіхалагічных ідэях па праблемах навучання і выхавання.

Пэўны ўклад уносіць наша кафедра і ва ўдасканальванне вучэбнага працэсу ва універсітэце, у абагульненне перадавога вопыту работы. У прыватнасці, высокую ацэнку атрымалі яе набыткі па актывізацыі пазнаваўчай дзейнасці студэнтаў. Вопыт гэтай работы адобраны Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і рэкамендаваны да ўкаранення ў ВНУ рэспублікі.

**Ф. КАДОЛ, Л. СЕЧКА,**
**кандыдаты педагагічных навук.**

*Да справаздач і выбараў у камсамоле*

# ГАЛОЎНЫ СХОД ГОДА

У адпаведнасці з пастановай бюро ЦК ВЛКСМ у верасні-кастрычніку праходзяць справаздачы і выбары ў камсамольскіх арганізацыях краіны. Пачынаюцца яны і ў камсамольскіх групах, курсавых, факультэцкіх арганізацыях нашага універсітэта.

Размова, якая адбудзецца на справаздачна-выбарных сходах сёлета, — асаблівая. У цэнтры ўвагі будзе праверка выканання юнакамі і дзяўчатамі рашэнняў XIX з'езда ВЛКСМ і XXVII з'езда камсамола Беларусі, дастойная сустрэча знамянальнай для нашай Радзімы падзеі — 60-годдзя ўтварэння СССР. Неабходна павесці размову аб тым, як вырашаюцца моладдзю задачы, пастаўленыя ў прывітанні ЦК КПСС XIX з'езду ВЛКСМ, рэкамендацыі з прамовы на ім Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР тав. Л. І. Брэжнева.

Часу пасля камсамольскіх форумаў прайшло не так ужо многа, але юнакам і дзяўчатам будзе аб чым гаварыць на сваіх сходах: далейшае развіццё атрымаў патрыятычны рух «11-й пяцігодцы — ударную працу, веды, ініцыятыву і творчасць маладых!». Справаздачна-выбарныя сходы павінны садзейнічаць павышэнню ролі моладзі ў барацьбе за камуністычныя адносіны да працы, высокую якасць вучобы. І вельмі важна, каб камсамольскія арганізацыі выкарысталі галоўны сход года для таго, каб дэталёва і грунтоўна разгледзець пытанні ўдзелу юнакоў і дзяўчат у сацыялістычным спаборніцтве за павышэнне якасці вучобы, выканання заданняў 11-й пяцігодкі. Кожнаму члену ВЛКСМ неабходна таксама вызначыць сваё месца ў агульнай рабоце па выкананню Харчовай праграмы СССР.

Зыходзячы з цэнтральнай задачы камсамола, трэба ўсебакова разгледзець работу камсамольскіх бюро па фарміраванню марксісцка-ленінскага светапогляду, класавай самасвядомасці юнакоў і дзяўчат, ступень уплыву камсамольскага калектыву на кожнага, яго ролю ў барацьбе за ўмацаванне камуністычнай маралі.

Цэнтральнае месца ў справаздачна-выбарнай кампаніі зоймуць пытанні выхавання моладзі ў духу камуністычнай ідэйнасці, савецкага патрыятызму і інтэрнацыяналізму, высокай арганізаванасці і дысцыплінаванасці. Неабходна вызначыць дзейсныя меры далейшага ўдасканальвання Ленінскага заліку «Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!», разгледзець пытанні маральнага, фізічнага, эстэтычнага выхавання юнакоў і дзяўчат.

Рашэнне кожнага з гэтых пытанняў яшчэ больш павысіць баявітасць камсамольскіх арганізацый, што і з'яўляецца першачарговай мэтай справаздач і выбараў. Камсамольская арганізацыя тады карыстаецца аўтарытэтам, калі ў ёй пануе жывая, творчая атмасфера, калі моцная дысцыпліна ўсіх яе членаў.

Дзейснасць камсамольскага сходу залежыць ад атмасферы, у якой ён будзе праходзіць, ад таго, як падрыхтаваны справаздачны даклад. Лепш за усё, калі даклад камсамольскага бюро курса, студэнцкай групы носіць канкрэтны, мабілізуючы характар, калі камсамольскі вожак гаворыць зацікаўлена і ўносіць дзелавыя прапановы. Тады і кожны прысутны на сходзе камсамолец не прамаўчыць, а возьме слова, каб выказаць свае думкі, меркаванні, крытычныя заўвагі.

Справаздачна - выбарныя сходы на факультэтах павінны садзейнічаць далейшаму падбору, расстаноўцы, выхаванню і навучанню камсамольскага актыву. Кіруючыя органы групавых, курсавых, факультэцкіх камсамольскіх арганізацый трэба фарміраваць з найбольш актыўных, дзелавых аўтарытэтных, ініцыятыўных камсамольцаў і маладых камуністаў. Работа многіх камсамольскіх арганізацый пераканаўча сведчыць аб тым, што выбранне камуністаў у кіруючыя камсамольскія органы садзейнічае павышэнню ўзроўню работы камсамольскіх арганізацый;

Час прад'яўляе ўсё больш высокія патрабаванні да кожнага камсамольскага актывіста. Яму трэба ўмець валодаць настроем калектыву, ствараць у ім добры псіхалагічны мікраклімат. У выбарныя камсамольскія органы трэба рэкамендаваць такіх людзей, якія карыстаюцца аўтарытэтам у моладзі. Вялікую дапамогу ў гэтым камсамольскім арганізацыям груп, курсаў павінны аказаць куратары, партыйныя бюро факультэтаў, дэканаты. Абнаўляючы састаў камсамольскага бюро, важна захаваць прынцып пераемнасці, умела аб'яднаць вопытных камсамольскіх актывістаў і навічкоў.

Важны, выключна адказны этап у жыцці ВЛКСМ патрабуе ад усіх нас высокай свядомасці, сабранасці, каб справаздачы і выбары правесці на высокім узроўні.

**У. ЧМЫХ,**
**намеснік сакратара камітэта ЛКСМБ па арганізацыйнай рабоце.**

*Весткі з практыкі*

# КРОКІ ДА ПРАФЕСІІ

Адным з найбольш важных этапаў пры падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў у любой галіне з'яўляецца практыка.

Для студэнтаў 5-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта ГДУ, будучых настаўнікаў, такім адказным этапам з'яўляецца педагагічная практыка, якую яны праходзяць у базавых школах. Адна з іх — СШ № 16 г. Гомеля, педагагічны калектыў якой прыняў нядаўна ў свае рады групу нашых студэнтаў. Кіраўніцтва школы з першых дзён нацэліла іх на тое, каб практыка спалучалася з актыўным удзелам у жыцці школы, ва ўсіх мерапрыемствах, якія праводзіць настаўніцкі калектыў.

Дырэктар школы М. Г. Барысаў расказаў студэнтам аб асноўных прынцыпах школазнаўства, спецыфіцы педагагічнай работы. Потым практыканты пазнаёміліся са школай, з настаўнікамі-прадметнікамі.

Аб арганізацыі пазакласнай работы ў школе студэнтам расказала Г. Е. Ярмілава. Але найбольш памятнай і хвалюючай была першая сустрэча студэнтаў-практыкантаў з класамі. Нават найбольш упэўненым у сабе цяжка было стрымаць сваё хваляванне. Цяпер, пасля двух тыдняў практыкі, нясмеласць першых сустрэч з вучнямі ўжо прайшла і выклікае ўсмешку. Знойдзен кантакт са школьнікамі, якія прызналі ў студэнтаў сваіх настаўнікаў.

Практыка ў школе праходзіць паспяхова. У авалоданні сакрэтамі прафесіі настаўніка дапамагаюць студэнтам выкладчык кафедры педагогікі і псіхалогіі Ф. У. Кадол, групавыя кіраўнікі З. М. Сямейных і Д. Д. Паўлавец. Заўсёды ахвотна даюць неабходныя разгорнутыя кансультацыі па прадмету настаўнікі школы Р. С. Цясленка, В. В. Цыганкоў, Б. Г. Фрэнклах. Яны ж праводзяць разам са студэнтамі падрабязны разбор праведзеных урокаў.

Лепш пазнаць вучня, даведацца, чым ён цікавіцца, а значыць, наладзіць з ім даверлівыя адносіны дапамагаюць разнастайныя пазакласныя мерапрыемствы: гутаркі, дыспуты, палітінфармацыі і інш. Іх і сталі праводзіць у школе практыканты. У канцы верасня, напрыклад, з дапамогай студэнтаў гістарычнага аддзялення камсамольская арганізацыя школы падрыхтавала і правяла тэматычны вечар «Чалавек працай слаўны», дыскатэку.

Наперадзе яшчэ пяць тыдняў работы ў школьным калектыве. Гэта будзе час далейшага спазнання прафесіі педагога, авалодання яе сакрэтамі.

**Ірына ЗАБАЎЧЫК,**
**Галіна ЛАМАКА, студэнткі 5-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**





**На здымках:** 1. Студэнткі-практыканткі Л. Васько і С. Ждан за падрыхтоўкай да ўрока па гісторыі. 2. Шасцікласнікі школы № 16 уважліва слухаюць матэрыял урока гісторыі, які вядзе пяцікурсніца ГДУ Н. Васілевіч.

Фота У. Чыспіка.

*Рэха працоўнага семестра — 82*

# ДА НАСТУПНАГА ЛЕТА

**Студэнцкае лета... Яно яшчэ доўга будзе ў памяці юнакоў і дзяўчат універсітэта, якія не ўяўляюць сябе без працы ў будаўнічым атрадзе і ў час летніх канікулаў апранаюць форму байца СБА. Пачаліся заняткі ва аўдыторыях, карпатлівая вучоба, а з ёй новыя цікавыя студэнцкія справы. Але ўсё роўна памяць зноў і зноў вяртае байцоў студэнцкіх атрадаў у трэці працоўны семестр-82.**

Самыя прыемныя ўспаміны аб леце застануцца ў байцоў студэнцкіх атрадаў ГДУ «Юнацтва» і «Верасы». Іх працоўны семестр праходзіў на Хойніцкім кансервавым заводзе. Дзяўчаты працавалі пад дэвізам «Працаваць лепш, павышаць эфектыўнасць і якасць». Штодзённа імі выконваўся план на 110—115 працэнтаў.

Адразу пасля прыезду і пачатку работы на заводзе атрады ўстанавілі цесныя кантакты з камсамольскай арганізацыяй прадпрыемства. Колькі цікавых мерапрыемстваў было праведзена разам! Камсамольскі сход, на якім абмяркоўваліся матэрыялы XIX з'езда ВЛКСМ, рэйды «Камсамольскага пражэктара» з мэтай выяўлення і ўхілення недахопаў у арганізацыі працы, матэрыялы якіх змяшчаліся на стэндах, даводзіліся да ведама адміністрацыі прадпрыемства. У вольны час былі таксама разам — праводзіліся вечары адпачынку, спартыўныя спаборніцтвы. Дзяўчаты з атрада «Юнацтва» арганізавалі вечар-сустрэчу з выпускнікамі Хойніцкага СПТВ-50 будаўнікоў.

Асаблівай цеплынёй, клопатамі акружылі байцы «Юнацтва» выхаванцаў Хойніцкага дзіцячага дома. Яны зрабілі тут рамонт, аформілі 4 стэнды, перадалі дзецям сабраную бібліятэчку. Адміністрацыяй дзіцячага дома дзяўчатам была выказана падзяка. А Т. Чарнянкова, Л. Санькова, І. Даманцэвіч, Л. Мурашкіна правялі 20 кансультацый для трох абітурыентаў, якія збіраліся паступаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы.

В. Баравік, Т. Рэпяшчук, Л. Кузняцова з атрада «Верасы» сталі сапраўднымі сябрамі для дапытлівай дзетвары дзіцячага сада кансервавага завода. У вольны час прыходзілі сюды дзяўчаты, каб правесці з малышамі цікавыя гульні, расказаць ім казкі. Калі ж дзеці спалі, студэнткі афармлялі пляцоўкі для гульняў, групавыя пакоі, альбомы.

На тэрыторыі Хойніцкага раёна знаходзіцца помнік даватарцам — мужным змагарам за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы. Над ім узялі шэфства байцы студэнцкіх атрадаў універсітэта. Каля помніка дзяўчаты зрабілі прапалку, пабялілі яго, ля падножжа заўсёды былі жывыя кветкі. Адбылася таксама экскурсія ў музей баявой славы Хойніцкай сярэдняй школы № 3, у час якой байцы атрада «Верасы» даведаліся аб баявых подзвігах воінаў, якія вызвалялі раён ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Але самым памятным днём усяго працоўнага лета стала для атрадаў 8 жніўня. Тады праходзіў фестываль СБА, прысвечаны 60-годдзю ўтварэння СССР. З цікавай праграмай пад назвай «XIX з'езду ВЛКСМ прысвячаецца» выступіла на фестывалі агітбрыгада атрада «Верасы». За высокае выканаўчае майстэрства яна была ўзнагароджана граматай аддзела культуры Хойніцкага райвыканкома, а дзяўчаты з атрада «Юнацтва» змаглі з поспехам выступіць і на спартыўных спаборніцтвах.

Цяжка было развітвацца з тымі мясцінамі, якія паспелі дзяўчаты палюбіць за час свайго знаходжання ў Хойніцкім раёне, з рабочымі прадпрыемства, дзе працавалі разам, з новымі сябрамі. І калі наступнае працоўнае лета зноў пакліча студэнтаў у дарогу, захочацца зноў дзяўчатам прыехаць сюды. Іх тут чакаюць.

**(Наш кар.).**

# ДА ЎВАГІ КУРАТАРАЎ І ПАЛІТІНФАРМАТАРАЎ!

Паведамляецца прыкладная тэматыка палітычных інфармацый і гутарак сярод студэнтаў у кастрычніку 1982 г.

**I. ПЫТАННІ ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ**

**1. Жывое ўвасабленне ленінскіх прынцыпаў нацыянальнай палітыкі.** (Аб замацаванні ў Канстытуцыі СССР ленінскіх ідэй непарушнага адзінства, роўнасці і ўсебаковага развіцця ўсіх нацый і народнасцей нашай краіны).

Матэрыял публікуе газета «Звязда».

**II. ПЫТАННІ ЭКАНАМІЧНАГА ЖЫЦЦЯ**

**2. Кожнаму дню перад'юбілейнай вахты — ударную працу.** (Аб патрыятычным імкненні працаўнікоў горада і вёскі азнаменаваць завяршальны перыяд юбілейнага года высокапрадукцыйнай, якаснай работай, аб шырокай падтрымцы ініцыятывы масквічоў правесці 18 снежня камуністычны суботнік у гонар 60-годдзя ўтварэння СССР).

Матэрыял публікуе газета «Советская Белоруссия».

**3. Расходам паліва і энергіі — строгі ўлік.** (Аб актыўным удзеле ўсіх і кожнага ў барацьбе за беражлівае, эканомнае расходаванне ў асеннее-зімовы перыяд паліва, цеплавой і электрычнай энергіі на вытворчасці і ў быце).

Матэрыял публікуе газета «Звязда».

**III. ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ І КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ**

**4. Берагчы і прымнажаць слаўныя традыцыі партыі і народа.** (Да дня нараджэння камсамола).

Матэрыялы публікуюць газеты «Знамя юности» і «Чырвоная змена».

**5. Быць верным свайму абавязку.** (Аб высокім грамадзянскім абавязку кожнага савецкага чалавека добрасумленна выконваць свой службовы, грамадскі і маральны абавязак).

Матэрыял публікуе газета «Чырвоная змена».

**IV. ПЫТАННІ МІЖНАРОДНАГА ЖЫЦЦЯ**

**6. Савецка-індыйскай дружбе мацнець.** (Да вынікаў прайшоўшых у Маскве савецка-індыйскіх перагавораў на вышэйшым узроўні).

Матэрыял публікуе газета «Звязда».

**7. Пакласці канец генацыду.** (Аб рашучым патрабаванні сусветнай грамадскасці неадкладна спыніць варварскую агрэсію і генацыд Ізраіля ў Ліване).

Матэрыялы публікуюць усе газеты.

**8. Капіталізм без прыкрас: без права на працу.** (Аб росце арміі беспрацоўных, «лішніх людзей» у капіталістычных краінах).

Матэрыял публікуе газета «Звязда».

# НАС ПАКЛІКАЛА НЕБА

Яшчэ не паспела сонца прагрэць ранішняе паветра, трава скінуць расу, а па вялікаму полю аэрадрома ўжо спяшаецца да блакітнага самалёта хударлявая дзяўчына. Хутка прывядуць пасажыраў, а ёй трэба паспець праверыць кіслародны балон, ці спраўныя прывязныя рамні і мікрафон, ці няма непатрэбных рэчаў у багажніку, ці ёсць на барту самалёта вада, паклапаціцца аб тым, каб у пасажырскім салоне было чыста, утульна. Здавалася б, няма нічога прасцей і лягчэй — выканаць гэтыя маленькія аперацыі. Але ад кожнай такой маленькай справы залежыць вельмі многае, а можа нават так здарыцца, што і лёс чалавека. Таму ў рабоце бортправадніцы самалёта няма дробязей. З'явіцца дакладна ў назначаны час, быць самай абаяльнай, добрай і ўважлівай — таксама абавязковыя правілы. І кожны абавязак бортправадніцы патрабуе адказнасці і дысцыплінаванасці. Забылася далажыць камандзіру, што на борце самалёта пяць кілаграмаў пошты або тона грузу — затрымка рэйса ў парту прызначэння на трыццаць-сорак мінут, парушэнне графіка палёту; пралічылася ў транзіце — лішнія пасажыры, якіх няма куды пасадзіць, або кагосьці не хапае — таксама рэйс можа затрымацца; не заўважыла парушанай упакоўкі грузу— вялікія матэрыяльныя страты, за якія павінна разлічвацца бортправадніца.

А колькі адказнасці ў рабоце з пасажырамі! Няхай за ілюмінатарам такі туман, што змрочна ў салоне і не відаць крыла самалёта, няхай самалёт непрыемна падкідвае моцны вецер, сцюардэса заўсёды пройдзе па салону са спакойнай прыемнай усмешкай і зробіць так, што стане ўтульна і цёпла ў самалёце сярод шэрых навальнічных хмар.

Вось такая прыгожая для ўсіх і вельмі цяжкая для саміх сцюардэс прафесія бортправадніц самалётаў. І мы, студэнткі гісторыка-філалагічнага, эканамічнага і матэматычнага факультэтаў універсітэта, байцы лётнага атрада «Аэліта», павінны былі стаць гэтым летам сапраўднымі сцюардэсамі, выконваць строга ўсе абавязкі і патрабаванні.

Зразумела, што на любой рабоце не толькі цяжка, але і цікава. Пра многае даведаліся, шмат пабачылі і мы. Пабывалі ў Сібіры і на Каўказе, у Нар'ян-Мары і на Чорным моры. І ні на што не праменялі б мы рамантыку бяздоннай блакітнай прасторы з асляпляльна белымі воблакамі, да якіх, здавалася, можна дакрануцца рукой. Але хутка праляцела лета, і зноў пара вучыцца. Бывай, неба, да наступнага лета!

**Алена КАЗАНЦАВА,**
**баец атрада «Аэліта».**



**АКРЫЛЕНАСЦЬ.** Фота А. Карніенкі.

*Навуковыя нарады*

# З ГЛЫБІНЬ МОВАЗНАЎСТВА

У горадзе Валгаградзе адбылася VII усесаюзная нарада па агульных пытаннях дыялекталогіі і гісторыі мовы, прысвечаная 60-годдзю ўтварэння СССР і 40-годдзю перамогі савецкіх войск пад Сталінградам.

У цэнтры ўвагі ўдзельнікаў нарады знаходзіліся важнейшыя працэсы, якія адбываюцца ў сучасных дыялектах, пытанні лінгвістычнай геаграфіі, моўных кантактаў і ўзаемадзеяння ўзроўняў мовы на розных гістарычных этапах. Гэтыя праблемы былі абмеркаваны ў дакладах і паведамленнях, з якімі выступіла каля 100 моваведаў — супрацоўнікаў акадэмічных інстытутаў і ВНУ з усіх саюзных і многіх аўтаномных рэспублік нашай краіны.

У нарадзе прынялі ўдзел і прадстаўнікі нашага універсітэта. Даклад доктара філалагічных навук прафесара У. В. Анічэнкі быў прысвечаны аналізу фанетыка-арфаграфічнага ўзаемадзеяння на розных этапах гісторыі беларускай мовы. Доктар філалагічных навук П. У. Сцяцко ў сваім дакладзе спыніўся на разглядзе асноўных словаўтваральных працэсаў у сучасных дыялектах беларускай мовы. У паведамленні аўтара гэтых радкоў разглядаліся адзінкі розных моўных узроўняў як база ўтварэння дыялектычных фразеалагічных зваротаў.

Даклады і паведамленні, зробленыя на нарадзе, праходзілі ў атмасферы зацікаўленасці і творчай дыскусіі. Гэтая прадстаўнічая нарада садзейнічала далейшаму развіццю навуковых даследаванняў у галіне дыялекталогіі і гісторыі мовы.

...Горад-герой Валгаград, які сардэчна прыняў гасцей, раскінуўся на беразе вялікай рускай ракі. Для людзей ва ўсім свеце слова «Сталінград» сімвалізуе гераізм і мужнасць савецкіх воінаў, якія спынілі фашысцкіх захопнікаў і нанеслі ім тут смяротны ўдар. З вялікім хваляваннем агледзелі ўдзельнікі нарады панараму «Сталінградская бітва», створаную мастакамі-баталістамі студыі імя Грэкава. Незабыўнае ўражанне пакінула ў нас і наведанне Мамаева кургана, на вяршыні якога ўзвышаецца велічны манумент «Радзіма-маці», славутага дома Паўлава. Нельга забыць і млын — жудасны напамін аб мінулай вайне — такі, якім ён быў адразу пасля Сталінградскай бітвы, і адзінокую таполю са шматлікімі слядамі ад куль і асколкаў, якая цудам засталася жывой у агні вялікай бітвы.

Пакідаючы горад-герой, горад-працаўнік, кожны з нас думаў аб тым, што правядзенне ўсесаюзнай нарады моваведаў у Валгаградзе знамянальна і сімвалічна. Лепшы помнік героям Вялікай Айчыннай вайны — чыстае, мірнае неба, натхнёная праца савецкіх людзей, дружба і братэрства народаў нашай краіны, якая рыхтуецца адзначыць свой 60-гадовы юбілей.

**У. КОВАЛЬ,**
**асістэнт кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства.**

*Правярае народны кантроль*

# РАЗ — У ПАМЯЦІ, ПЯЦЬ — У... КІШЭНІ

У апошніх пастановах партыі і ўрада ўказваецца на неабходнасць строгай эканоміі сыравіны, матэрыялаў, усіх відаў энергіі. Праверка выкарыстання матэрыяльных каштоўнасцей, праведзеная галоўнай групай народнага кантролю сумесна з бухгалтэрыяй, паказала, што асобныя работнікі адміністрацыйна - гаспадарчай часткі універсітэта дапускаюць сур'ёзныя парушэнні і нават злоўжыванні.

Прывядзем факты. Супастаўленне фактычна выкананых работ у галоўным корпусе са складзеным актам на іх правядзенне інжынерам па капітальнаму рамонту А. С. Паплаўскім больш чым здзіўляе. Аб'ёмы завышаны ў пяць з лішнім разоў. Рамонтныя работы фактычна выкананы на 477 $м^2$, а акт складзены, падпісаны адказным работнікам АГЧ і зацверджаны прарэктарам па адміністрацыйна - гаспадарчай частцы, зафіксаваў 2740 $м^2$. У выніку пераплачана 424 рублі заработнай платы і звыш нормы спісана на 448 рублёў матэрыялаў, якія пайшлі невядома па якому прызначэнню.

Была праведзена і праверка аб'ёмаў выкананых работ на аграбіястанцыі ў Чонках. Фактычная абшыўка дамоў тут склала 955 пагонных метраў, а па акту, пададзенаму ў бухгалтэрыю, значыцца 3025 м. Толькі па зарплаце пераплата склала 219 рублёў. У гэтым жа акце А. С. Паплаўскі зафіксаваў замену дошак вонкавай абшыўкі ў аб'ёме 806 пагонных метраў, што ў сапраўднасці не рабілася. Матэрыялы ж былі спісаны.

Падобныя прыклады можна працягваць. За такія ўчынкі А. С. Паплаўскі неаднаразова меў спагнанні. Але належных вывадаў не зрабіў. Асуджэння заслугоўваюць і іншыя адказныя работнікі АГЧ, якія чамусьці не заўважалі злоўжыванняў інжынера па капрамонту. Думаецца, па матэрыялах праверкі нарэшце будуць прыняты адпаведныя меры.

4-га кастрычніка савецкі народ адзначыць 50-гадовы юбілей Грамадзянскай абароны СССР. Бібліятэка ГДУ сумесна з камітэтам ДТСААФ арганізавалі ў галоўным корпусе універсітэта маляўніча аформленую выстаўку «Грамадзянскай абароне — 50 гадоў». Матэрыялы, прадстаўленыя на ёй, самыя разнастайныя. Асаблівую цікавасць у наведвальнікаў выклікаюць матэрыялы XXVI з'езда КПСС, кніга А. В. Толсцікава «КПСС аб неабходнасці ўдасканальвання грамадзянскай абароны», дапаможнікі для кіраўнікоў заняткаў па ГА.




**На здымку: наведвальнікі знаёмяцца з выстаўкай.**

Фота У. Чысціка.

*Да 50-годдзя ўтварэння Грамадзянскай абароны СССР*

# НАДЗЕЙНЫ ШЧЫТ АЙЧЫНЫ

Яшчэ ў 1918 годзе, арганізуючы адпор контррэвалюцыі і замежнай інтэрвенцыі, У. І. Ленін падкрэсліваў, што для вядзення вайны па-сапраўднаму неабходны моцны, арганізаваны тыл. Гэта ленінскае палажэнне прадугледжвала і неабходнасць надзейнай абароны насельніцтва і эканомікі прыфрантавых раёнаў ад удараў ворага з паветра.

Пасля грамадзянскай вайны партыя і ўрад прынялі рад пастаноў аб арганізацыі абароны стратэгічна важных раёнаў краіны ад нападзення з паветра і абароны насельніцтва ад хімічнай зброі. Так, 4 кастрычніка 1932 года Савет Народных Камісараў зацвердзіў «Палажэнне аб супрацьпаветранай абароне тэрыторыі Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік». Гэты дзень прынята лічыць днём нараджэння мясцовай супрацьпаветранай абароны (МПВО), пераўтворанай ў далейшым у Грамадзянскую абарону СССР. Агульнае кіраўніцтва падрыхтоўкай насельніцтва і народнай гаспадаркі да абароны ў святле патрабаванняў палажэння ажыццяўлялі гарадскія і раённыя Саветы дэпутатаў працоўных. Галоўную ролю ў навучанні насельніцтва і асабовага саставу фарміраванняў МПВО адыгрывалі арганізацыі Асавіяхіма і Саюза Таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца.

У чэрвені 1941 года наша рэспубліка адной з першых падверглася вераломнаму нападзенню фашысцкіх агрэсараў. Як і для ўсіх савецкіх людзей, лозунг «Усё для фронту, усё для перамогі над ворагам!» стаў для гамяльчан у тыя дні галоўным. У першы ж дзень вайны адбылося экстраннае пасяджэнне абласнога камітэта КП(б)Б. Былі распрацаваны мерапрыемствы па мабілізацыі ў армію грамадзян прызыўнога ўзросту, фарміраванню атрадаў самаабароны, па перабудове ўсёй гаспадаркі вобласці на ваенны лад. У найкарацейшыя тэрміны заводы імя Кірава, «Гомсельмаш», «Рухавік рэвалюцыі» (зараз тарфянога машынабудавання), лесакамбінат і іншыя перайшлі на выпуск ўзбраення, боепрыпасаў і ваеннай амуніцыі, наладзілі рамонт markup рознай баявой тэхнікі.

Калі пачаліся масіраваныя налёты фашысцкай авіяцыі на Гомель, дакладна дзейнічала служба назірання і апавяшчэння МПВО. У гэтыя дні выключную стойкасць і мужнасць праявілі камандзіры і байцы пажарных часцей і фарміраванняў Ф. С. Дарафееў, С. А. Бернштэйн, А. В. Харкевіч, С. П. Фамін і многія іншыя. Як героі загінулі пры тушэнні пажару на заводзе імя Кірава начальнік пажарнай часці Р. К. Юзянкоў — ураджэнец вёскі Радуга Веткаўскага раёна і баец А. В. Кавалёў — ураджэнец вёскі Бабовічы Гомельскага раёна. Аб іх подзвігу паведамляла ў тыя дні газета «Гомельская праўда».

Масавы подзвіг здзейснілі працоўныя вобласці, удзельнічаючы ў эвакуацыі прамысловага абсталявання. Па некалькі сутак, не ўходзячы з цэхаў, яны дэманціравалі станкі. Аб маштабах гэтай работы можна меркаваць па такому факту: для вывазу абсталявання заводаў імя Кірава, «Гомсельмаша» і паравозавагонарамонтнага спатрэбілася больш 2,5 тысячы вагонаў.

Не зменшылася роля і значэнне МПВО і пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны. Адразу ж пасля вызвалення нашай вобласці ад акупантаў быў створан батальён МПВО, аднаўлены раённыя і гарадскія штабы. Клопатаў у разбураных гарадах хапала ўсім гэтым службам, асабліва піратэхнічным падраздзяленням. Да сённяшняга дня ў розных месцах выяўляюцца бомбы, снарады, міны, якія неабходна абясшкодзіць.

Калі імперыялісты развязалі «халодную вайну» супраць СССР і краін сацыялістычнай садружнасці, сталі адкрыта рыхтаваць планы атамнага нападзення, роля і значэнне абаронных мерапрыемстваў у тыле шматразова ўзраслі. У чэрвені 1961 года МПВО была пераўтворана ў Грамадзянскую абарону СССР, якая стала састаўной часткай сістэмы агульнадзяржаўных абаронных мерапрыемстваў, праводзімых у мірны і ваенны час у мэтах абароны насельніцтва і народнай гаспадаркі краіны ад зброі масавага знішчэння і іншых сродкаў нападзення.

Многія прадпрыемствы, установы, іх неваенізаваныя фарміраванні, штабы і службы грамадзянскай абароны дабіліся высокіх паказчыкаў у выкананні абаронных мерапрыемстваў. Гэта перш за ўсё вынік клопатаў кіраўнікоў і партыйных арганізацый аб'ектаў народнай гаспадаркі аб далейшым удасканаленні гэтай справы.

Добра вырашаюцца задачы ГА ў раёнах горада Гомеля, Мазыры і Светлагорску, Хойніцкім, Рагачоўскім, Петрыкаўскім і іншых раёнах. На працягу многіх гадоў у сацыялістычным спаборніцтве лідзіруюць калектывы гомельскіх заводаў — станкабудаўнічага імя Кірава, «Электраапаратура», вытворчых аб'яднанняў «Гідрааўтаматыка» і «Белэмальпосуд», Светлагорскага завода штучнага валакна, калгасаў «Рассвет» Хойніцкага, «Ленінскі шлях» Брагінскага раёнаў.

У ходзе падрыхтоўкі да 60-годдзя ўтварэння СССР штабы і службы нашых фарміраванняў, усе працоўныя калектывы азнамянуюць 50-гадовы юбілей Грамадзянскай абароны СССР новымі поспехамі ў яе далейшым удасканаленні.

**М. КАЗЛОЎ,**
**начальнік штаба грамадзянскай абароны вобласці.**

# НАСУСТРАЧ СЛАЎНАМУ ЮБІЛЕЮ

Увесь гэты год для нашага калектыву прайшоў пад знакам прадстаячага святкавання слаўнага юбілею — 60-годдзя СССР. Мы заўсёды лічылі і лічым, што наш прамы абавязак не проста даць магчымасць набыць кнігу. Імкнемся несці ў масы інфармацыю аб планах выдавецтваў, знаёмім сваіх пакупнікоў з тым, што ўжо ў бліжэйшы час з'явіцца ў нашай кнігарні. Мелі поспех нашы выстаўкі-продажы, прысвечаныя ўтварэнню адзінай шматнацыянальнай Краіны Саветаў: «Аб савецкім ладзе жыцця», «СССР — апора міру», «Крочыць адзінаццатая пяцігодка», «Квітней, мая Беларусь», «Беларусь савецкая», «СССР — знаменосец міру», «Табе, прапагандыст», «Ленінскім курсам да камунізму». Прычым, не абмяжоўваемся толькі памяшканнем сваёй кнігарні. Наладжваем такія выстаўкі ў залах бібліятэк, у студэнцкіх аўдыторыях, выязджаем на прадпрыемствы, як гэта было на заводах «Гомелькабель», электраапаратуры, «Гідрапрывад». Сумесна з супрацоўнікамі універсітэцкай бібліятэкі праводзілі чытанні па кнігах Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева «Адраджэнне» і «Цаліна».

Вось і сёння карыстаемся выпадкам на старонках універсітэцкай шматтыражнай газеты праінфармаваць нашых пастаянных і будучых пакупнікоў аб тым, якую літаратуру, прысвечаную 60-годдзю СССР, яны змогуць набыць у нашай кнігарні.

**Клопат партыі і ўрада аб дабрабыце народа. Зборнік дакументаў. (1974 — люты 1980 г.)** Кн. 2-я. М., Палітвыдавецтва, 1980.

**АКІМАЎ Н. Н. КПСС — партыя стваральнікаў камунізму.** Мн., «Беларусь», 1981.

**ПАРТЫЯ І САВЕТЫ (Б. М. Марозаў, Н. Н. Вінаградаў і іншыя).** М., Палітвыдавецтва, 1982.

**БЕЛЯЎЦАЎ В. І., СУЧКОЎ К. П. Запаветам Леніна верныя.** Мн., «Беларусь», 1981.

**У САЮЗЕ НЕПАРУШНЫМ (Паўлаў С. Е. і іншыя).** Мн., «Беларусь», 1982.

**ЖЫБУЛЬ І. Я. Гуманізм савецкага ладу жыцця.** М., «Наука и техника», 1982.

**Беларуская ССР у адзінаццатай пяцігодцы.** Мн., 1982.

**«Пяю маю Айчыну, рэспубліку маю». Украіна. У сям'і адзінай,** М., «Савецкі мастак», 1982.

**Н. БЕТАНАВА,**
**прадавец кнігарні № 19.**

# НАВЕДАЙЦЕ ВЫСТАЎКУ

У кнігарні № 5 «Навукова-тэхнічная кніга» (праспект Леніна, 45) адкрыта выстаўка-продаж кніг «Студэнтам ВНУ і тэхнікумаў». Прысвячаецца яна 60-годдзю ўтварэння СССР.

Несумненную цікавасць для студэнтаў уяўляе кніга Г. М. Голіна «Класікі фізічнай навукі», якая выйшла ў выдавецтве «Вышэйшая школа». У кнізе змешчаны кароткія творчыя біяграфіі выдатных вучоных-фізікаў ад антычнасці да нашага часу. Тут ёсць найбольш важныя звесткі аб навуковай рабоце вучоных, расказваецца пра іх самыя яркія старонкі жыцця і дзейнасці.

У выдавецтве «Наука» ў серыі «Гісторыя навукі і тэхнікі» выйшла кніга В. Я. Фрэнкеля і Б. Е. Явелава «Эйнштэйн — вынаходнік». У кнізе асветлена малавядомая галіна дзейнасці Эйнштэйна — яго канструктарска-вынаходніцкая творчасць. Гэты аспект дзейнасці вучонага да гэтага не асвятляўся ні ў айчыннай, ні ў замежнай манаграфічнай літаратуры.

Студэнтам - матэматыкам магазін прапаноўвае вучэбны дапаможнік А. Н. Калмагорава, С. В. Фаміна «Элементы тэорыі функцый і функцыянальнага аналізу», М., «Наука», 1981. Кніга адрасавана студэнтам механіка-матэматычных і фізіка-матэматычных факультэтаў універсітэтаў.

Кніга Р. Габасава, Ф. Кірылавай «Метады аптымізацыі» (Мн., выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна) разлічана на студэнтаў факультэтаў матэматычнага профілю. У другім выданні дапаможніка (першае выйшла ў 1975 годзе) ўдасканалены доказы тэарэм, дэталёва распрацаваны раздзелы па актуальных праблемах аптымізацыі, якія знайшлі шырокае прымяненне ў практыцы.

Студэнтам старэйшых курсаў універсітэтаў адрасавана кніга М. І. Кваргаполава, Ю. І. Мерзлякова «Асновы тэорыі груп», М., «Наука», 1982. Акрамя традыцыйнага матэрыялу, у ёй выкладаюцца некаторыя апошнія дасягненні ў гэтай галіне, якія яшчэ не атрымалі адлюстравання ў манаграфічнай літаратуры.

Слухачы падрыхтоўчых аддзяленняў ВНУ могуць набыць кнігу М. К. Патапава і інш. «Алгебра і аналіз элементарных функцый». Дапаможнік напісаны на аснове лекцый, якія чыталіся на падрыхтоўчым аддзяленні МДУ імя М. В. Ламаносава. У ім прыводзяцца некаторыя паняцці і азначэнні, якіх няма ў школьных падручніках, але без якіх немагчыма вывучэнне вышэйшай матэматыкі.

Наведайце нашу кнігарню.

**Л. АСІПЕНКА,**
**загадчыца магазіна.**

*Каляндар прыроды*

# КАСТРЫЧНІК

Кантрасты — асноўная прыкмета кастрычніка. У Арктыцы намячаецца пераход да зімы, у субтропіках восень толькі пачалася, а ў сярэдняй паласе яна ў самым разгары. Кароткімі сталі дні, доўгім асенняе змярканне.

Шмат спраў у кастрычніку ў лесаводаў. Яны збіраюць і сеюць насенне розных дрэў і кустоў. Занятыя і садаводы: беляць вапнай яблыні і грушы, абвязваюць маладыя ствалы толем, хваёвымі галінкамі. Гэта ратуе зімой пладовыя дрэвы ад грызуноў, а вясной — ад сонечных апёкаў.

Напярэдзе доўгае глухазім'е, таму, калі выдаўся пагожы дзянёк, абавязкова схадзіце ў лес. Блакітнымі зорачкамі яшчэ цвіце цыкорый, залатымі плямамі гарыць піжма, срэбрам адліваюць каласкі пушыцы. Невялікі букет з палявых кветак упрыгожыць дом і дапаможа надоўга захаваць у памяці цудоўную карціну апошніх дзён залатой восені.

**СПОРТ**

# ФЕХТАВАЛІ ЮНЫЯ

У Брэсце адбылося юнацкае першынство Белсавета ДСТ «Буравеснік» па фехтаванню. Сярод дзяўчат старэйшага ўзросту чэмпіёнкай стала студэнтка другога курса факультэта фізвыхавання Алена Дзямчук. У групе спартсменак 1965—1966 года нараджэння вызначылася першакурсніца гэтага ж факультэта Вольга Пятруша. Яна заваявала сярэбраны жэтон

У агульным заліку маладыя фехтавальшчыкі ГДУ (за каманду выступала 9 чалавек) набралі 275 ачкоў.

**В. ЛІСОЎСКІ,**
**трэнер каманды, майстар спорту СССР.**

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

**Рэктарат, партком і прафком універсітэта выказваюць глыбокае спачуванне сакратару рэктарата МЯТЛІЦКАЙ Марыі Міхайлаўне з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці МАЦІ.**

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССІ па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 2 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п 3-11, т. 56-16-52.
АЗ 20584
Заказ 5182